# Экалагічны транспарт

Развіццё зялёнага транспарту цесна звязанае з іншымі сферамі эканомікі – энергетыкай, горадабудаўніцтвам, знешнім гандлем, прамысловасцю, сельскай гаспадаркай, захаваннем біяразнастайнасці і развіццём турызму.

*- На долю транспарту прыпадае 12% эмісіі CO2 і 64,5% забруджвальных рэчываў.*

*- 35,4% гарадскіх перавозак прыпадае на электратранспарт, у тым ліку метро. Доля перавозак электрацягнікамі складае 31%.*
*- Смяротнасць у ДТЗ (61 чалавек на 1 млн жыхароў) у два разы вышэйшая, чым у Швецыі.*

## Чаму трэба рэфармаваць транспартную сістэму Беларусі:

1. **Выкіды ад транспарту негатыўна ўплываюць на здароўе і працягласць жыцця**. Паводле экспертаў з EEA штогод каля паўмільёна еўрапейцаў памірае з-за нізкай якасці паветра. Асноўнай крыніцай яго забруджвання з'яўляюцца аўтамабілі. Павелічэнне колькасці аўтамабіляў у горадзе на 1% прыводзіць да росту кошту сацыяльных паслуг на 0,5%.
2. Новая экалагічная палітыка ЕС **"Еўрапейскі зялёны курс" істотна паўплывае на эканоміку Беларусі**. Знізіцца попыт на нафтапрадукты, прадукцыя МТЗ, Белаз, МАЗ, якая не адпавядае экалагічным стандартам, не будзе дапушчаная на рынак, больш жорсткія патрабаванні будуць прад'яўляцца да экалагічнасці перавозак. У 2026 г. ў ЕС будзе ўведзены збор на ўвоз карбанаёмкай прадукцыі, і пры разліку карбонавага следу будуць улічвацца выкіды не толькі падчас вытворчасці, але і транспартавання сыравіны і прадукцыі.
3. Для транспартнага сектара Беларусі характэрныя **залежнасць ад паставак энергарэсурсаў**, **састарэлы аўтапарк** асабістага і грамадскага транспарту, высокі траўматызм, састарэлыя стандарты гарадскога планавання, недастатковая транспартная даступнасць рэгіёнаў, абмежаваныя міжнародныя транспартныя зносіны.

Рэгламенты ЕАЭС не накіраваныя на амбіцыйную экалагізацыю транспартнага сектара, а зніжэнне залежнасці ад нафтавага паліва не ў інтарэсах краін-экспарцёраў нафты, якія ўваходзяць у ЕАЭС. Выклікам для Беларусі стане гарманізацыя заканадаўства з нормамі ЕС і адаптацыя прамысловасці да новых стандартаў, уключэнне ў агульнаеўрапейскія транспартныя сістэмы.

*ЕС плануе скараціць выкіды ад транспарту на 90% да 2050 г., дзякуючы:*
*- скарачэнню спажывання выкапнёвага паліва,*
*- адмове ад продажу транспарту з рухавікамі ўнутранага згарання да 2035 г.,*
*- новым стандартам экалагічнасці,*
*- сістэме карбонавага ўліку і дадатковых збораў “забруджвальнік плаціць”.*

Важна не проста замяняць аўтамабілі на электрычныя, але і скарачаць колькасць паездак за кошт гарадскога планавання, пешых і веласіпедных прагулак, укараняць экалагічны грамадскі транспарт у т.л. чыгуначны, выкарыстоўваць чыстыя віды паліва.

Канцэпцыя ўстойлівай мабільнасці кладзе ў аснову патрэбы чалавека і аб'ядноўвае ў цэласную сістэму розныя віды транспарту, інфраструктуру, разумную сістэму кіравання. У сучасным свеце пачынае дамінаваць падыход "мабільнасць як паслуга”, г.зн. чалавеку важна не валодаць аўтамабілем, а магчы хутка і зручна даехаць у любую кропку.

## Карысць для беларусаў

Экалагізацыя транспартнага сектара дасць магчымасць павысіць энергетычную бяспеку краіны і канкурэнтаздольнасць прамысловасці. Будуць створаныя працоўныя месцы ў вытворчасці зялёнага транспарту, акумулятараў, паліва, IT-рашэнняў для разумнай мабільнасці і лічбавізацыі.

Гарады стануць больш камфортнымі для жыцця, усе рэгіёны краіны – больш даступнымі, міжнародная транспартная сетка адкрые краіну для турыстаў, а Еўропу – для беларусаў. Чысцейшае паветра і магчымасці для актыўнага адпачынку палепшаць здароўе і якасць жыцця беларусаў.

## Як зрабіць транспарт Беларусі больш экалагічным?

Паспяховасць рэформы залежыць не толькі ад развіцця тэхналогій і інвестыцый, але і ад лібералізацыі эканомікі, надзялення паўнамоцтвамі муніцыпалітэтаў, гатоўнасці людзей змяніць лад жыцця, развіцця зялёнага фінансавання.

| Мэта | Практычная рэалізацыя |
|---|---|
| **1. Ствараць устойлівую мабільнасць** | |
| Прастора, захопленая аўтамабілямі, вяртаецца гараджанам | - Зменшыць плошчы дарог і адкрытых парковак<br>- Скарачаць паездкі за кошт кампактнай гарадской забудовы, стварэння пешаходных зон у цэнтрах гарадоў<br>- Пашыраць сеткі веласіпедных дарожак і тратуараў |
| Рэгіянальныя перавозкі: ад рэйсавага раскладу да патрэбаў | - Стварыць сістэму мультымадальных перавозак і перахапляльных парковак у гарадах<br>- Развіваць рачное суднаходства і сетку аэрапортаў |
| Шырокія міжнародныя зносіны | - Уключыць Беларусь у еўрапейскую транспартную сетку TEN-T<br>- Дапусціць лоўкост авія- і аўтобусныя кампаніі на рынак<br>- Пашырыць сетку хуткасных міжнародных цягнікоў |
| Развіццё канцэпту "мабільнасць як паслуга" | - Увесці адзіны праязны білет<br>- Інтэграваць усіх перавознікаў, у тым ліку нерэйсавых<br>- Звязаць з праграмамі і электроннымі картамі |
| **2. Развіваць экалагічныя транспарт і паліва** | |
| Развіццё электратранспарту | - Знізіць пошліны і падаткі на чысты транспарт, субсідыі<br>- Увесці прагрэсіўныя зборы – «забруджвальнік плаціць больш»<br>- Стварыць шырокую сетку электрычных заправак<br>- Наладзіць зборку электракараў сусветных марак у Беларусі |
| Чысты і зручны грамадскі транспарт | - Павялічыць колькасці электробусаў, тралейбусаў, трамваяў<br>- Пераводзіць камунальны транспарт на чыстае паліва<br>- Шэрынг аўтамабіляў, самакатаў, ровараў<br>- Развіваць карпулінг |
| Электрыфікацыя чыгункі | - Уключыць электрычкі ў мультымадальную сістэму<br>- Электрыфікаваць пасажырскія і грузавыя перавозкі |
| Экалагічна чыстае паліва | - Выпрацоўваць біягаз з арганічных адходаў<br>- Пашыраць лінейку біяпаліва<br>- Наладзіць чыстую вытворчасць акумулятараў і іх перапрацоўку |
| **3. Укараняць інавацыі ў сферы транспарту** | |
| Вытворчасць экалагічнага транспарту | - Распрацаваць лінейку камунальнага, гарадскога, с\г транспарту на біягазе, электрычнасці і вадародзе<br>- Выпрацоўваць сінтэтычнае паліва на НПЗ Беларусі |
| Стварэнне ўмоў для інавацый і інвестыцый | - Падтрымліваць беларускіх навукоўцаў і стартапы<br>- Стварыць зоны тэставання "транспарту будучыні": дронаў, беспілотнікаў, дастаўкі, разумных сетак |

### *Крыніцы фінансавання рэформы*

Каб замяніць 3,2 млн. легкавых аўтамабіляў на электрамабілі, патрэбна больш за 100% ВУП Беларусі, што нерэалістычна. Таму трэба скарачаць колькасць аўтамабіляў праз аптымізацыю сістэмы грамадскага транспарту, зыходзячы з патрэбаў людзей і мэтазгоднасці.

Развіццё ўласнай вытворчасці дасць магчымасць развіваць прамысловасць, экспарт і сферу паслуг, прыцягне інвестыцыі, створыць працоўныя месцы.

*Аўтары: Аляксандра Мамаева ў супрацы з беларускім экспертам*
*Падрыхтавана CASE у супрацы з Эканамічнай камандай*
*Офіса Святланы Ціханоўскай пры фінансавай падтрымцы MATRA*